УДК 364.27

# «ПЕНСІЙНЫ» СУІЦЫД: ПСІХАЛАГІЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ

***А. В. Панасюк***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*
*Навуковы кіраўнік:* ***С. В. Венідзіктаў****,*
*начальнік кафедры сыцыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Па дадзеных нацыянальнай статыстыкі, доля смяротнасці з прычыны суіцыдаў у Беларусі складае 1,5 %. На думку людзей, старэйшых за 65 гадоў, асноўныя прычыны, якія вядуць да самагубства, — злоўжыванне алкаголем і зацяжная дэпрэсія [1].

Фактары суіцыдальных паводзін у старэйшай узроставай групе шмат у чым звязаны з сацыяльна-дэмаграфічнымі характарыстыкамі: 1) узрост (група рызыкі — асобы, старэйшыя за 45 гадоў); 2) пол (колькасць суіцыдаў вышэй у мужчын, парасуіцыдаў — у жанчын); 3) сямейнае становішча (група рызыкі — адзінокія, бяздзетныя); 4) прафесійны статус (выхад на пенсію, статус беспрацоўнага); 5) рэлігійныя погляды (узровень суіцыдаў вышэйшы сярод нерэлігійных асоб).

Асноўныя суб’ектыўныя матывы суіцыдальных паводзін у старэйшай узроставай групе: 1) імкненне звярнуць увагу на сябе, забяспечыць сацыяльныя кантакты; 2) імкненне выклікаць пачуццё віны ў блізкага чалавека ў сітуацыі міжасобаснага канфлікту; 3) імкненне пазбегнуць непрыемнай жыццёвай сітуацыі; 4) жаданне спыніць псіхалагічныя ці фізічныя пакуты (у сітуацыі хваробы); 5) рэалізацыя гіпертрафіраванага пачуцця віны, самапакаранне; 6) немагчымасць псіхалагічна перанесці страту (смерць) блізкага чалавека; 7) страта суб’ектыўнага адчування сэнсу існавання.

Як правіла, суіцыдальны акт выклікаецца больш чым адным матывам. Напрыклад, пажылы чалавек у дэпрэсіўным стане можа адчуваць як патрэбу ў пазбяганні неперанoснай сітуацыі і ў самапакаранні, так і імкнуцца дэманстраваць свае пакуты з мэтай пошуку дапамогі. Развіццё суіцыдальных матывацый часта правакуецца стрэсавымі падзеямі: міжасобаснымі праблемамі, адхіленнямі, змяненнем сацыяльнага статусу, страхам пакарання і непрыняцця, крыўдай.

На наш погляд, асноўным інстытутам, які мусіць займацца прафілактыкай суіцыдаў, з’яўляецца сям’я. Таксама важную ролю адыгрываюць медыцынскія установы, грамадскія арганізацыі, сродкі масавай інфармацыі.

1. Венидиктов С. В., Даниленко С. И., Ярошевич Е. А. Психология девиантного поведения : учеб. пособие. Могилев : Могилев. ин-т МВД, 2017. 320 с. Вернуться к статье